якіх будучы выпускнік-музыкант зможа творча раскрыць мастацкі змест любога музычнага твора. У працэсе навучання выкладчык павінен рыхтаваць не толькі выканаўцу-музыканта, але і прапагандыста музычнай культуры сярод насельніцтва.

Такім чынам, працуючы над музычным творам, выкладчык ставіць задачы навучыць студэнта правільна тлумачыць змест твора, яго стыль, форму і ідэйна-мастацкую накіраванасць, умела адбіраць лепшыя ўзоры музычнай літаратуры. Гэтым самым выкладчык садзейнічае фарміраванню добрага мастацкага густу ў свайго вучня.

Праца над рэпертуарам у класе павінна заканчвацца публічным выступленнем. Гэта могуць быць акадэмічныя канцэрты, іспыты, залікі, удзел у конкурсах. Публічныя выступленні з'яўляюцца працягам навучальнага працэсу, на аснове яго аналізу выкладчык і студэнт змогуць падвесці вынікі іх сумеснай дзейнасці і акрэсліць план далейшай працы.

Кузьмініч М.Л., дацэнт

## АДУКАЦЫЙНЫЯ СТАНДАРТЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ВЫКЛАДЧЫКА

Працэс абнаўлення зместу навучання, які распачаўся ў канцы 80-х гадоў, разам са станоўчымі вынікамі мае і некаторыя адмоўныя: усе большая дыферэнцыяцыя навучання на асобных спецыялізацыях суправаджаецца ўнясеннем змен у базіснае ядро вышэйшай адукацыі, перанасычэннем вучэбнага плана, перагрузкай студэнтаў і г.д. Таму ўзнікла неабходнасць удакладніць абавязковы для ўсіх студэнтаў адукацыйны мінімум, выпрацаваць пэўныя стандарты педагагічнага працэсу на аснове дзяржаўных нарматываў.

Адукацыйны стандарт - гэта дзяржаўная норма адукаванасці, якая ўдакладняе змест і структуру адукацыі, узровень засваення зместу адукацыі, формы і метады вымярэння і ацэнкі вынікаў навучальнай дзейнасці. Асноўнымі аб'ектамі стандартызацыі з'яўляюцца: змест адукацыі, яе структура, аб'ем навучальнай нагрузкі і ўзровень падрыхтоўкі навучэнцаў. Стандарт спецыяльнасці (спецыялізацыі) павінен вызначаць мэты навучання, кампанентны склад (пералік дысцыплін) агульнай і спецыяльнай падрыхтоўкі спецыяліста. Стандарт дысцыплін павінен уключаць мэты навучання, кампанентны склад курса (раздзелы, тэмы, вучэбныя элементы), асноўныя заканамернасці і паняцці, узровень іх увядзення і плануемы ўзровень валодання імі.

Змест стандарту можна колькасна вымераць і даць якасную ацэнку. Бягучы і тэматычны кантроль за навучальнай дзейнасцю студэнтаў павінен замацоўвацца выніковай праверкай дасягнення патрабаванняў дзяржстандарту (кваліфікацыйныя дзяржаўныя экзамены; сістэма кантрольных заданняў для выпускнікоў, якія ахопліваюць асноўныя віды прафесійнай дзейнасці спецыяліста, веданне тэорыі, заканамернасцей і паняццяў, прадугледжваюць узровень засваення агульнавучэбных ведаў і уменняў, методыкі самастойнай работы і інш.). Укараненне адукацыйных стандартаў не пазбаўляе выкладчыка магчымасці рэалізоўваць свае творчыя педагагічныя здольнасці ў межах, вызначаных нарматывамі. Спецыфіка дзейнасці педагога заключаецца ў тым, што поўная яе алгарытмізацыя немагчыма, бо існуючыя педагагічныя прыемы і навыкі ўвесь час выкарыстоўваюцца ў нестандартных сітуацыях, што патрабуе іх карэкцыі. Педагог выкарыстоўвае метадычныя распрацоўкі і рэкамендацыі, акумулюе вопыт калег, прапускаючы ўсе гэта праз сваю творчую індывідуальнасць. Педагог павінен абапірацца на агульныя заканамернасці педагагічнага працэсу, але ў рэалізацыі іх заўсёды адчуваецца непаўторная творчая індывідуальнасць.

Такім чынам, адукацыйны стандарт не супрацьпастаўляецца педагагічнай творчасці выкладчыка, а задае ей пэўны накірунак, дае магчымасць вымераць эфектыўнасць працы педагога і ўсей навучальнай установы.

Нехаенка У.М., дацэнт

## ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ ТЭХНІЧНАГА МАЙСТЭРСТВА ПІЯНІСТА: ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ

Аўтарытэт айчыннай фартэпіяннай школы высокі і агульнапрызнаны. Ён складваўся з конкурсных дасягненняў, канцэртнай, педагагічнай дзейнасці майстраў і іх навукова-метадычнай спадчыны. У цэлым фартэпіяннае выкананне і педагогіка - тая сфера мастацтва, якая адпавядае сусветным стандартам і нават вызначае іх. Гэта стала магчымым дзякуючы склаўшайся сістэме і традыцыям прафесійнай музычнай адукацыі. Іх вытокі звязваюцца з адкрыццём у 19 ст. Маскоўскай і Пецярбургскай кансерваторый. У іх адкрыцці рашаючае значэнне мелі наяўнасць выдатных музыкантаў, здольных стварыць добрыя педагагічныя калектывы, і арганізатарская ініцыятыва братоў Рубінштэйн, якія валодалі вялікім музыканцкім аўтарытэтам і сталі іх першымі дырэктарамі. Для станаўлення прафесіяналізму вялікае значэнне меў тон, зададзены імі як піяністамі-лідэрамі. Іх выканальніцкія і педагагічныя прын-

цыны паклалі аснову традыцыям, якія вызначылі шляхі развіцця айчыннага піянізму.

Адна з важнейшых прафесійных задач, атрымаўшых практычнае развіццё і тэарэтычнае асэнсаванне, - тэхнічная падрыхтоўка піяніста. Мікалай Рубінштэйн, стварыўшы ў сваёй творчасці эталоны тэхнічнай дасканаласці, аказаў уплыў на станаўленне характэрнай для Маскоўскай кансерваторыі традыцыі - вялікая ўвага да пытанняў піянізму і яго тэхналогіі.

Для даследчыкаў і выканаўцаў уяўляюць цікавасць эвалюцыя поглядаў на ролю тэхнічнай падрыхтоўкі, практыка розных майстраў і іх погляды на праблему.

Узровень вырашэння пытанняў тэхнічнай падрыхтоўкі ў розных музычных навучальных установах неаднолькавы. Хочацца падкрэсліць, што тэхнічнае ўдасканальванне піяніста - складаны і паэтапны працэс і поспех залежыць ад яго якаснай рэалізацыі на ўсіх ступенях музычнай адукацыі.

З гэтага пункту гледжання найбольш спрыяльныя ўмовы ўзнікаюць у рамках унікальнага адукацыйнага цыкла ліцэй-акадэмія з адзінай метадычнай канцэпцыяй. Такі цыкл не мае аналагаў у свеце.

Іншае становішча ў цыкле музычнае вучылішча -акадэмія. Справа ў тым, што музычныя вучылішчы маюць значна большую аўтаномію, чым ліцэй, і таму актуальнай застаецца праблема адзінай метадычнай палітыкі. Адсюль вынікае, што рашэнне канкрэтнай прафесійнай задачы ў многім вызначаецца дакладнасцю ўзаемадзеяння ўсіх звёнаў музычнай адукацыі.

Вышэйшым крытэрыем у ацэнцы тэхнічных навыкаў з'яўляецца разгляд іх у кантэксце стылю, зместу твора, яго інтэрпрэтацыі. Аднак гэта не выключае неабходнасці фундаментальнага, сістэматычнага і нефармальнага вывучэння элементарных, базавых кампанентаў тэхнічнай падрыхтоўкі (гам, арпеджыо і інш.). Апошняе вызначаецца ў якасці актуальнай задачы і разглядаецца як умова аднаўлення часткі страчаных традыцый тэхнічнага ўдасканальвання. Ва ўдасканальванні вялікая роля належыць навыкам самастойнага аналізу тэхнічных цяжкасцей, тэарэтычным і агульнамузычным ведам.

Патрэбнасць у пастаянным удасканаленні майстэрства з'яўляецца прыметай прафесійнай культуры, спрыяльнай умовай для самаўдасканалення асобы ў цэлым.

Ажыгін С.І.,
дацэнт

## ВЫХАВАННЕ СТУДЭНТА Ў КЛАСЕ СПЕЦІНСТРУМЕНТА

У пытаннях удасканальвання методыкі навучання і выхавання студэнтаў вялікая роля павінна адводзіцца выхаванню ў студэнта такіх якасцей, як працаздольнасць, мэтанакіраванасць, воля. Гэтыя якасці дапамагаюць сфарміраваць уменне самастойна працаваць .

Перыяд навучання ў ВНУ культуры і мастацтва характарызуецца многімі складанасцямі. Выкладчык сустракаецца з асобамі, у значнай ступені ўжо сфарміраванымі. Таму ў працэсе работы выкладчыку даводзіцца адначасова вырашаць дзве задачы: выхоўваць і перавыхоўваць.

Часта выкладчык сустракаецца з недахопамі прафесійнага характару: няправільнай пастаноўкай губ, дыхання, гукаўтварэння і інш. Часу ў выкладчыка вельмі мала. Таму педагогам па спецдысцыплінах як мага хутчэй трэба вывучыць недахопы студэнта, яго станоўчыя і адмоўныя рысы характару. Сустракаюцца вучні з павышанай эмацыянальнасцю, у якіх, як правіла, не хапае цярпення выслухоўваць выкладчыка. Бываюць і вучні, якія хваравіта рэагуюць на папярэджанне выкладчыка. Таму вельмі важна і для студэнта, і для выкладчыка ўмець валодаць сабой, кантраляваць свае эмоцыі. Часам выкладчык сустракаецца з вельмі нервовым вучнем, і патрабуецца шмат увагі і такту, каб выхаваць у вучня ўпэўненасць ў сваіх сілах.

Цяжкасці работы з навучэнцамі ўскладняюцца і тым, што ў выкладчыкаў могуць быць свае асаблівасці і працы, і характару. Але ў любым выпадку выкладчыку трэба заўсёды ўлічваць узровень ведаў і падрыхтаванасці навучэнца. У гэтым выпадку педагог зможа прапанаваць навучэнцу твор, які адпавядае яго магчымасцям, развіццю выканаўчых навыкаў.

Вядома, як бы многа выкладчык ні працаваў, ён не справіцца са складанымі задачамі, калі не будзе вывучаць вопыт сваіх калег, павышаць сваю педагагічную кваліфікацыю, вывучаць ўсе новае, што з'яўляецца ў педагогіцы, методыцы навучання, штодзённа ўдасканальваць працэс навучання.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ